Прыватная ўласнасць на зямлю. Вынікі сацыялагічнага апытання (стар. 3)
Пасля «базара» Алеграву не змаглі купіць у Мінску (стар. 4)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец "Газэта СВАБОДА, Ltd."
Наклад 39.500
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 362441

16 ліпеня 1996 г. | № 52 | Кошт свабодны

Мсьё Лукашэнку ў Парыжы ацанілі

Французаў традыцыйна прынята лічыць дасціпнымі людзьмі. Удзячнай глебай для практыкаванняў у досціпах стала для французскай прэсы тэма візіту беларускага прэзідэнта ў Парыж.

«Мсьё Лукашэнка — адзін з рэдкіх высокапастаўленых чыноўнікаў — грамадзянаў Беларусі, — які можа ў гэтыя дні свабодна выехаць за межы сваёй краіны», — іранізуе **Le Mond**, маючы на ўвазе апошнія заявы мсьё Лукашэнкі наконт увядзення з 1 ліпеня жорсткага кантролю за замежнымі камандзіроўкамі чыноўнікаў любога рангу.

Карэспандэнтцы *Figaro* Лауры Мандэвіль (якая назвала свой артыкул ***«Лукашэнка, Мінскі каўдзільё»***) у вобразе беларускага прэзідэнта мроіцца нешта д'ябальскае. *«Ягоны позірк кобры гіпнатызуе натоўп. Ягоныя дыктатарскія метады прымушаюць замаўчаць парламент і прэсу. Ягонае захапленне Гітлерам хвалюе Захад. Ад Аляксандра Лукашэнкі — беларускага прэзідэнта, які з афіцыйным трохдзённым візітам прыбывае ў Парыж, — адчувальна патыхае серай»*, — такі вось мефістофельскі партрэт.

Прэса нагадвае публіцы гісторыю імклівага кар'ернага ўзлёту Аляксандра Лукашэнкі, заўважаючы пры гэтым: *«Ягонае мінулае — спачатку палітрука чырвонай арміі, а потым старшыні калгаса — больш чым цьмянае»*. *«Уражвае, — піша* **Le Mond**, *— што прарыў Аляксандра Лукашэнкі на вяршыню ўлады не прыцягнуў асаблівай увагі заходніх палітыкаў, схільных недаацэньваць палітычную эвалюцыю былых расійскіх ускраін. І дарэмна. Шлях Лукашэнкі пераканаўча ілюструе выхад на палітычную арэну ў рэспубліках былога СССР выпадковых палітыкаў, якія вылучыліся дзякуючы смутным пераходным часам і ў любы момант гатовыя вярнуцца да формаў аўтарытарнага кіравання»*. **Figaro** цытуе французскага дыпламата, які наракае на цяжкасці кантактаў з падобнага роду палітыкамі: *«Праблема ў тым, што мы не ведаем іхняй сістэмы каштоўнасцяў, іхніх прыярытэтаў, таго, што яны здольныя выкінуць заўтра. Яны непрадказальныя»*.

Непрадказальнасць беларускага прэзідэнта ілюструецца шматлікімі прыкладамі ягонай дзейнасці. Па інтанацыі артыкулаў французскай прэсы бачна, наколькі шакіраванай да сённяшняга дня застаецца Еўропа збіццем у верасні 1995 г. амерыканскага паветранага шара і яшчэ ў большай ступені тым, што беларускія ўлады ўслед за гэтым выставілі Злучаным Штатам штраф у 60 долараў за незаконнае перасячэнне навігатарамі мяжы. Гэты факт не абмінае ніводная з газетаў. Узгадваецца і збіццё дэпутатаў апазіцыі, і заклік прэзідэнта не ісці галасаваць на выбарах у новы Вярхоўны Савет, і адносіны да прэсы, і разгон масавых дэманстрацыяў, і закрытыя суды над маніфестантамі, і забарона свабодных прафсаюзаў, і дэпартацыя лідэра «Салідарнасці», і захапленне Гітлерам. Пералік падобнага роду дзеянняў беларускага прэзідэнта прыводзіць кожнае выданне. Артыкулы, прысвечаныя Беларусі, займаюць па цэлай паласе. І большыню матэрыялаў складае апісанне гісторыі двухгадовага прэзідэнцтва Лукашэнкі.

(Працяг на стар. 2)

ПАДРЫХТОЎКА

Мэр Мінска ўжо з дубінкай

Створаны аргкамітэт па святкаванні Дня незалежнасці 27 ліпеня.

Каардынуе працу камітэта намеснік старшыні БНФ Юры Хадыка. Ад імя арганізатараў у гарвыканкам пададзеная заяўка на правядзенне ў Мінску 27 ліпеня шэсця ад плошчы Незалежнасці да помніка Янку Купалу, дзе плануецца правесці мітынг і канцэрт.

На здымку: старшыня Мінскага гарвыканкама У. Ярмошын рыхтуецца...

Ці дойдзе справа да імпічменту?

Парламенцкая фракцыя «Грамадзянскае дзеянне» заявіла аб гатоўнасці ініцыяваць імпічмент прэзідэнта

«Крызіс набыў характар нацыянальнай катастрофы: ідзе распад эканомікі, расце масавае збядненне насельніцтва, назіраецца росквіт карупцыі, людзі прыгнечаныя бесперспектыўнасцю», — гаворыцца ў заяве фракцыі, якая была распаўсюджаная ў мінулы чацвер у Вярхоўным Савеце і перададзеная ў прэсу. «Грамадзяне» адзначаюць, што галоўным фактарам паглыблення крызісу стала палітыка прэзідэнта, які не жадае разумець тэндэнцый сучаснага грамадскага развіцця, а занепакоены толькі ўзмацненнем асабістай улады, дзеля чаго папіраецца Канстытуцыя і нават пачаліся рэпрэсіі супраць апазіцыйных сіл.

«Цяпер ужо неістотна, што кіруе дзеяннямі Лукашэнкі: амбіцыі, прага бязмежнай улады ці шчырая ўпэўненасць у сваёй праваце. Зараз трэба спыніць гэтыя дзеянні, якія штурхаюць Беларусь у бездань», — заяўляе фракцыя «Грамадзянскае дзеянне». У якасці выйсця дэпутаты прапануюць правесці круглы стол асноўных палітычных сіл краіны, дамагчыся аднаўлення канстытуцыйнай законнасці і ўтварэння кааліцыйнага ўрада, які будзе складацца з прафесіяналаў і мець адпаведныя паўнамоцтвы для правядзення рашучых эканамічных рэформаў. Калі ж прэзідэнт адмовіцца ад прынцыповых змен у сваёй палітыцы, то, на думку членаў фракцыі, застаецца адзіны варыянт выратавання краіны — адхіленне Лукашэнкі ад улады. «Грамадзянскае дзеянне» заяўляе аб сваёй гатоўнасці стаць ініцыятарам працэдуры імпічмента ў Вярхоўным Савеце і падкрэслівае, што юрыдычныя падставы для гэтага існуюць: *«Канстытуцыйны суд неаднаразова фіксаваў грубыя парушэнні прэзідэнтам Канстытуцыі і законаў краіны»*.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Добры англійскі дзядзька заплаціў за Беларусь

Як ужо пісала СВАБОДА ў матэрыяле «Шарэцкаму сорамна ехаць у Стакгольм», Беларусь была пазбаўленая права голасу ў АБСЕ за няплату членскага ўзносу — сумы каля 9 тыс. долараў. Менавіта па гэтай прычыне на чарговую сесію парламенцкай Асамблеі АБСЕ адмовіўся ехаць старшыня Вярхоўнага Савета.

Тым не менш тры беларускія парламентарыі — Віктар Цярэшчанка, Ігар Катляроў і Мікалай Бекіш — накіраваліся ў Шведскую сталіцу і прысутнічалі на ўсіх паседжаннях Асамблеі ў няпэўнай якасці: ці то назіральнікаў, ці то проста гледачоў. Аднак знайшоўся чалавек, сэрца якога не вытрымала такой ганьбы для Беларусі. Скарбнік АБСЕ, дэпутат палаты абшчын Вялікабрытаніі Пітэр Эмеры з уласных грошай заплаціў за Беларусь неабходную суму. Гэты высакародны ўчынак стаў для нашых парламентарыяў поўнай нечаканасцю. Беларускія дэпутаты напісалі даўгавую распіску, у якой ад імя дзяржавы паабяцалі спадару Эмеры вярнуць ягоныя грошы. Брытанец, дарэчы, папрасіў зрабіць гэта як мага хутчэй, бо, паводле ягоных словаў, калі жонка даведаецца, то выганіць яго з дому.

Узнос быў унесены ў перадапошні дзень працы Асамблеі, і беларуская дэпутацыя змагла прыняць удзел у галасаванні заключных рэзалюцыяў. Гэта, відаць, унікальны выпадак у еўрапейскай гісторыі.

Віталь ЦЫГАНКОЎ

Супрацоўнік прэзідэнцкай аховы падазраецца ў забойстве бацькі

Мінская абласная пракуратура вядзе следства па справе забойства жыхара Мінска А.Пазнякова, 1946 г. нараджэння.

Ягоны труп з агнястрэльным раненнем у галаву быў знойдзены ў прыдарожнай лесапалосе каля в.Арэшнікі Смалявіцкага раёна. Па звестках рэдакцыі, сярод тых, хто падазраецца ў забойстве Пазнякова, лічыцца і ягоны сын, які працуе ў ахове прэзідэнта Беларусі. Вядома, што 4-га ліпеня ў гэтага афіцэра аховы была ўзята падпіска аб нявыездзе, што, аднак, яшчэ не сведчыць аб ягонай віне.

Алесь ПАЎЛОВІЧ

У «Народнай газеты» – два рэдактары

На сённяшні дзень «Народная газета» мае, па сутнасці, двух галоўных рэдактараў: Міхаіла Шыманскага і Леаніда Юнчыка.

Першага прызначыў сваім указам Лукашэнка, а другога зацвердзіў на мінулым тыдні Вярхоўны Савет, які лічыць, што прэзідэнт незаконна «канфіскаваў» парламенцкую газету.

За прызначэнне Л.Юнчыка (ён дэпутат ВС, журналіст) на пасаду галоўнага рэдактара «Народнай газеты» прагаласавала 122 дэпутаты. Прадставіць новага шэфа калектыву «НГ» парламент даручыў віцэ-спікеру Г.Карпенку.

Аднак прэзідэнцкая адміністрацыя не пагадзілася вызваліць кабінет ад свайго рэдактара. У мінулую пятніцу, калі Карпенка раніцай прыйшоў у рэдакцыю разам з трыма дэпутатамі, каб выканаць даручаную місію, там ужо былі людзі з адміністрацыі прэзідэнта. Яны пераконвалі, нібыта прэзідэнцкі ўказ мае вышэйшую сілу, чым пастанова ВС. Генадзь Карпенка палічыў спрэчку з чыноўнікамі бессэнсоўнай. Такім чынам, «Народнай газетай» пакуль працягвае кіраваць М.Шыманскі, а легітымны рэдактар Л.Юнчык чакае, што вырашыць кіраўніцтва Вярхоўнага Савета. Пачакаем і мы.

Мікола ГРЫНЯВІЦКІ

На здымках: віцэ-спікер Генадзь Карпенка ў кабінеце галоўнага рэдактара «Народнай газеты». Побач з ім Міхаіл Падгайны (начальнік упраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі адміністрацыі прэзідэнта) звязваецца па тэлефоне з рэзідэнцыяй прэзідэнта. На суседнім здымку — Леанід Юнчык.

Фронт маладзее

Беларускі народны фронт правёў у мінулыя выхадныя палітычную канферэнцыю, на якой былі падведзены вынікі вясенніх падзеяў і вызначаны чарговыя мэты БНФ.

Удзельнікі канферэнцыі пагадзіліся з «трыядай» бліжэйшых дзеянняў, якія вызначыла кіраўніцтва Фронту: далейшая прапаганда нацыянальнай ідэі, падрыхтоўка да восеньскіх выбараў у парламент і пашырэнне кола саюзнікаў у палітычнай барацьбе, у тым ліку шляхам паляпшэння адносін з партыямі дэмакратычнага лагеру.

На думку аглядальнікаў, фронтаўцам удалося «ўтрасці» і некаторыя пытанні ўнутранага жыцця. Напрыклад, у адсутнасць лідэра БНФ было прадэманстравана, што ў Фронце падрасла новая генерацыя кіраўнікоў, якая адрозніваецца большай цярпімасцю і палітычнай гнуткасцю. Дарэчы, у новым кансультацыйным органе (Палітычным камітэце), створаным на канферэнцыі, маладое пакаленне, хутчэй за ўсё, будзе адыгрываць значную ролю.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Мсьё Лукашэнку ў Парыжы ацанілі

(Пачатак на стар. 1)

Чаму ж Францыя, якая так добра ведае цану беларускаму прэзідэнту, запрасіла яго з візітам у Парыж? Французскія палітыкі не могуць не разумець, што на фоне ўсеагульнага асуджэння недэмакратычнага рэжыму Лукашэнкі гасцінны ягоны прыём у Елісейскім палацы будзе ўспрыняты як ухваленне ці, прынамсі, талераванне ягонай палітыкі. І менавіта такім чынам візіт гэты падаецца беларускай афіцыйнай прэсай.

Адзін высокапастаўлены чыноўнік адміністрацыі Жака Шырака патлумачыў гэта так: *«Найгоршым з варыянтаў было б адмовіцца ад дыялогу пад маркай таго, што, маўляў, Лукашэнка непрэзентабельны. Беларусь знаходзіцца ў сэрцы Еўропы. Мы не можам рабіць выгляд, што яе не існуе, гэтак жа, як мы не адмаўляемся ад кантактаў з сярэднеазіяцкімі палітыкамі»*. Прафесар-гісторык Сарбонскага універсітэта Франсуаза Том, каментуючы гэтае меркаванне ў інтэрв'ю беларускай службе радыё «Свабода», зазначае: «Гэтае запрашэнне, па-мойму, — памылка французскай знешняй палітыкі, параўнальная хіба з той памылкай, якую зрабіў Мітэран, калі наведаў у снежні 1989 г. ГДР. Крыніца гэтых промахаў французскай дыпламатыі адна і тая ж: гэта — жаданне падабацца Маскве. Вядома, французскія палітыкі апраўдваюцца тым, што нельга ізаляваць Беларусь, што можна было б, маўляў, унушыць некаторыя прынцыпы еўрапейскіх паводзінаў Лукашэнку і г.д. Але тады я задаюся пытаннем: чаму не заўважалі Беларусь, калі яна спрабавала застацца суверэннай, калі яна была дэмакратычнай дзяржавай? Чаму запрасілі Лукашэнку менавіта пасля падпісання дамовы аб рэінтэграцыі з Расіяй? Атрымліваецца, быццам Францыя першая з усіх заходніх краінаў бласлаўляе аднаўленне Савецкага Саюза».

Традыцыі асаблівага сантыменту Парыжа да Масквы сягаюць яшчэ ў часы палітыкі Дэ Голя. Як вядома, Дэ Голь заўсёды лічыў, што СССР — з'ява часовая, затое Расія — пастаянная. Шмат шуму нарабіў у свой час візіт у 1966 г. Дэ Голя ў СССР: ён наведаў Маскву і Ленінград, і, ступіўшы на перон Ленінградскага вакзала, працытаваў паруску вывучаныя дзеля гэтага выпадку вершы Пушкіна:

Красуйся, град Петров,
И стой неколебимо, как Россия!

У Еўропе гэты дэ-голеўскі дывертысмент выклікаў тады недаўменне і сапраўдны пярэпалах. Галіцкую палітыку ў дачыненні да Расіі праводзілі потым сацыяліст Мітэран і цяпер праваарыентаваны Шырак.

Але сённяшняе палітычнае аблічча Францыі вызначаецца не толькі і не столькі прарасійскімі сімпатыямі, колькі цяперашнім агульным нервозным станам у гэтай дзяржаве. Францыя, якая яшчэ да нядаўняга часу была не толькі заканадаўцам модаў, але і заканадаўцам еўрапейскай палітыкі, пасля аб'яднання Нямеччыны згубіла свае лідэрскія пазіцыі. Згаданы Франсуазай Том візіт Мітэрана ў 1989 г. у ГДР, спроба захаваць берлінскую сцяну хаця б у руінах — была адчайным намаганнем не дапусціць узнікнення ў Еўропе небяспечнага канкурэнта...

Нямеччына аб'ядналася. Яе магутны эканамічны патэнцыял, аўтарытэт і роля, якую яна пачала адыгрываць у еўрапейскай палітыцы, адсунулі Францыю на другі план. Яскрава выявілася тое, што Парыж паспяхова маскаваў на працягу апошніх дзесяцігоддзяў: роля, на якую прэтэндавала амбітная, крыўдлівая Францыя — завялікая для яе, улічваючы абмежаваныя эканамічныя і палітычныя габарыты гэтай дзяржавы. Занадта доўга Францыя жыла не па сродках.

Кажуць, што жанчыну можна любіць за розум, прыгажосць і кепскі характар. Краіну, напэўна, таксама. У Францыі — кепскі характар. Комплекс непаўнавартасці, які ўзнік у яе ў дачыненні да Нямеччыны, сапсаваў гэты характар яшчэ больш. Кампенсоўваць гэты комплекс яна пачала капрызамі і грымасамі сваёй палітыкі. Адмова ад спынення ядзерных выпрабаванняў, абмежаванне дзейнасці Шэнгенскіх пагадненняў на сваёй тэрыторыі, запрашэнне сёлета ў красавіку з візітам у Парыж кітайскага прэм'ер-міністра Лі Пэна — усе гэтыя, на першы погляд, не звязаныя паміж сабою і рознапланавыя дзеянні — стаяць у адным шэрагу. Прыём у Елісейскім палацы беларускага прэзідэнта — працяг усё той жа палітыкі.

Магчымае і яшчэ адно тлумачэнне. Пры трохі недаўменнай разгубленасці Захада перад новымі постсавецкімі дзяржавамі, пры агульнай вычакальнай пазіцыі ў дачыненні да іх і даволі вялым жаданні ісці на шчыльны кантакт — Францыя можа заняць пустуючую нішу каардынатара такіх кантактаў, стаць своеасаблівым мастком паміж Еўропай і маладымі слабадэмакратычнымі краінамі. Тое, што падчас перамоваў з Лукашэнкам закраналіся перспектывы ратыфікацыі падпісанага паміж Еўрасаюзам і Беларуссю пагаднення ад партнёрстве, і тое, што Парыж паабяцаў сваё спрыянне, — можна лічыць яшчэ адным паказчыкам таго, што Францыя не супраць узяць на сябе ролю своеасаблівага апекуна і забяспечыць пратэжыраванне любому рэжыму — абы ён толькі да яе з гэтай просьбай звярнуўся.

Францыі вельмі хочацца, каб яе ізноў заўважылі. Што ж, запрасіўшы ў Парыж беларускага прэзідэнта, — яна свайго дамаглася.

Алена РАДКЕВІЧ

«Усход» супраць пяцідзесятнікаў

Жыхары мікраараёна «Усход-2» у Мінску патрабуюць спыніць будаўніцтва евангельска-хрысціянскага цэнтра ў «зялёнай зоне».

У сваім звароце да ўладаў яны сцвярджаюць, што будаўніцтва «ставіць пад пагрозу не толькі фізічнае, але і духоўнае здароўе дзяцей». На сходзе жыхароў мікраараёна выступіла прэзідэнт грамадскай арганізацыі «Азон», якая пераконвала прысутных у «небяспечнасці секты пяцідзесятнікаў, карані якой у ЗША».

Раённы архітэктар, які выступіў на сходзе, растлумачыў, што дазвол на будаўніцтва хрысціянскага цэнтра выдаў гарвыканкам. Раней тут планавалася ўзвядзенне адміністрацыйна-культурнага цэнтра Першамайскага раёна, але з-за недахопу грошай пляц перадалі рэлігійнай арганізацыі хрысціян веры евангельскай «Гефсіманія». Удзельнікі сходу, аднак, не хацелі слухаць ніякіх тлумачэнняў, збіраючы подпісы пад рэзалюцыяй пратэсту.

Прадстаўніца Мінскага гарвыканкама, якая ўзначальвае сектар па сувязях з рэлігійнымі арганізацыямі, сказала карэспандэнту СВАБОДЫ, што абшчына, якая будуе цэнтр, адносіцца да пратэстанцкай канфесіі, уваходзіць у Саюз хрысціян веры евангельскай і не з'яўляецца сектай. Саюз аб'ядноўвае 311 цэркваў на тэрыторыі Беларусі. Хрысціяне веры евангельскай аказваюць значную гуманітарную дапамогу гарадскім бальніцам, таварыству глуханямых, працуюць ў калоніях, у школе-інтэрнаце, хутка даставяць мінчанам медыкаменты на мільён долараў. Цэнтр, які пачалі будаваць у мікраараёне «Усход», мае рэлігійна-культурны накірунак. Вернікі абяцаюць прывесці ў парадак навакольную тэрыторыю і зрабіць дзіцячую пляцоўку для адпачынку.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Беларускі рок – адмяняецца

Магілёўскія ўлады сарвалі праграму IV Міжнароднага фестываля духоўнай музыкі «Магутны Божа».

Яны забаранілі маладзёжную акцыю «Беларускі рок насустрач фестывалю «Магутны Божа». Намеснік старшыні гарвыканкама Уладзімір Цумараў патлумачыў забарону тым, што тэксты песень не былі прадстаўленыя на зацвярджэнне аргкамітэту фестываля. Пераканаць чыноўніка не здолеў нават старшыня журы, народны артыст, прафесар Віктар Роўда. Правядзенне рок-акцыі падтрымалі такія вядомыя людзі, як паэт Рыгор Барадулін і міністр працы Аляксандр Сасноў, а таксама Беларускі фонд Сораса, які выдаткаваў на фінансаванне імпрэзы 1.500 долараў. Аднак Цумараў патлумачыў, што ён «вельмі паважае думку гэтых выдатных дзеячоў, але песні трэба зацвярджаць».

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Шарэцкі таксама любіць коней

У калгасе «Камунар» Навагрудскага раёна адбыўся 2-гі этап агульнабеларускіх конных спаборніцтваў на прыз прэзідэнта РБ і кубак Дзяржплемконепрама.

З Навагрудка ў вёску Поўбераг публіку вазілі бясплатныя аўтобусы. Такая шчодрасць раённых уладаў, магчыма, тлумачыцца тым, што паглядзець на конную язду прыехаў сам старшыня парламента Сямён Шарэцкі, родная вёска якога — Лаўрышава — знаходзіцца непадалёк.

В.В.

Супраць суддзі пачалі справу

У Мсціславе спыненыя паўнамоцтвы аднаго з мясцовых суддзяў.

Мсціслаўскі суддзя вярнуў былым уладальнікам маёмасць, якая была сканфіскаваная па ранейшым рашэнні суда. Гэта — вялікая партыя імпартовых цыгарэтаў на некалькі мільярдаў рублёў. Супраць суддзі распачатая крымінальная справа.

Іван ЗАСАДА

Град пабіў грады

У вёсцы Чапунь у Іўеўскім раёне выпаў буйны град — велічынёю з лясныя арэхі.

Усё, што вырасла ў вясковых гародах, было знішчана і змяшана з зямлёю. У заценёных месцах град растаў толькі на наступны дзень.

В.В.

Новая пані-пасол?

Паслом Рэспублікі Польшча ў Беларусі хутчэй за ўсё будзе прызначаная Эва Спыхальска — старшыня Агульнапольскай федэрацыі прафсаюзаў (OPZZ).

У польскіх СМІ хадзілі чуткі, што яе кандыдатура разглядаецца на пасаду амбасадара ў Расіі. Але сама Э.Спыхальска ў інтэрв'ю *Radio Gdańsk* сказала, што атрымала прапанову ўзначаліць дыпламатычную місію ў Беларусі і «сур'ёзна яе абдумвае». Да 15 жніўня яна павінна даць адказ.

Э.Спыхальска стаіць на чале 4-мільённай арганізацыі, і ў параўнанні з гэтым пасольская пасада выглядае як бы «паніжэннем». Аднак у *OPZZ* — «афіцыйных» прафсаюзах, якія засталіся ў Польшчы яшчэ з камуністычных часоў і супрацоўнічаюць сёння з левымі палітычнымі сіламі, — паглыбляецца крызіс кіраўніцтва. У гэтай сітуацыі выезд у Мінск дае магчымасць шэфу *OPZZ* ганарова пакінуць свой пост.

Такім чынам, калі Э.Спыхальска будзе прызначаная амбасадарам у Беларусі, працягнецца традыцыя «жаночай дыпламатыі»: першым польскім паслом у Мінску, як памятаем, была Эльжбета Смулэк.

Анджэй БАРАВЕЦКІ, *Гдыня*

Берастаўіцкія касінеры

Жыхары Вялікай Берастаўіцы адзначылі 490-ыя ўгодкі свайго мястэчка.

Сёння ў гэтым раённым цэнтры, які знаходзіцца побач з беларуска-польскай мяжой, жыве 6 тысяч чалавек. У XVI стагоддзі Берастаўіца належала вялікім князям літоўскім, а потым вядомым магнацкім родам — Хадкевічам, Мнішкам, Патоцкім і Касакоўскім.

Падчас тэатралізаванага свята па вуліцах Вялікай Берастаўіцы прайшлі касінеры Кастуся Каліноўскага, ролю якіх выконвалі працаўнікі прадпрыемства электрасетак. Яны паказалі вопратку ды ўзбраенне паўстанцаў і трымалі ў руках транспарант з заклікам «За зямлю! За волю!», досыць актуальны сёння. Вядома, што атрад каліноўцаў у 1863 годзе сапраўды быў у Берастаўіцы. А падчас апошняй вайны ў гэтых мясцінах — тады яшчэ акупаванай немцамі Беластоцкай вобласці БССР — дзейнічала партызанская брыгада імя Кастуся Каліноўскага.

С.А.

Нядоўга музыка іграла...

Чыноўнікі райвыканкама Мядзела (Мінская вобл.) справілі наваселле.

Цяпер яны будуць кіраваць будаўніцтвам «рынкавага сацыялізму» з кабінетаў былога райкама КПБ. У гэтым будынку апошнія пяць гадоў размяшчалася дзіцячая музычная школа, якая атрымала шыкоўныя партыйныя апартаменты пасля нацыяналізацыі маёмасці КПСС-КПБ у 1991 г. Але, як бачым, нядоўга музыка іграла. Мядзельскі райвыканкам прыняў рашэнне перасяліць музычную школу ў будынак райаграпрама, аграчыноўнікаў перавялі ў выканкамаўскі будынак, а сама «вертыкаль» пераехала ў былыя партыйныя кабінеты. Старшыня Мядзельскага райвыканкама сказаў карэспандэнту СВАБОДЫ, што «дзецям у будынку РАПА будзе значна лепш займацца музыкай, бо там сцены таўсцейшыя».

Валодзя ЯНЧУК

ЭКОНОМИКА

Банковский кризис был организован?

Все идет к тому, что в стране останется несколько крупных полугосударственных банков

Банковский кризис, начавшийся месяц назад, продолжает «раскручиваться». В результате не осталось практически ни одного банка, не имеющего финансовых проблем. Большинство из них задерживают (а некоторые вообще не проводят) платежи, что, естественно, выбивает из колеи предприятия.

На примере России и Прибалтики мы уже имели возможность наблюдать, чем чреват кризис банковской системы. Он вовсе не ограничивается серией банкротств нескольких и так обреченных банков. Банковский кризис приводит к неплатежеспособности всей финансовой системы страны, в результате чего парализуется функционирование экономики.

Возникает вопрос: что делают в этой ситуации правительство и Национальный банк. Да вобщем-то ничего радикального. В то время, когда банкам еще можно было оказать помощь и «подбросить» денег, Нацбанк, который призван осуществлять регулирование банковской системы, был слишком занят своими внутренними проблемами (необходимо было в срочном порядке разоблачить некоторых неугодных заместителей председателя правления и др.). Теперь, когда уже поздно, принимаются совсем иные меры. В них достаточно четко прослеживается до боли знакомая линия *национализации*.

Уже сейчас некоторые банки приняли решение о присоединении к более крупным. Причем это не самые «плохие» банки. В ближайшее время тенденция «воссоединения» получит свое развитие, и банковская система Беларуси будет насчитывать уже не 40, а значительно меньше коммерческих банков.

В конце июля начнется перерегистрация коммерческих банков. Помимо величины уставного фонда к ним будет предъявлена еще масса жестких требований. Судя по состоянию банков на сегодняшний день, перерегистрацию пройдут лишь единицы (не трудно предположить, кто именно). В результате остальным придется либо присоединиться к тем, кто прошел, либо самоликвидироваться. Таким образом, должно остаться 6 крупных полугосударственных банков, о которых так упорно говорил в свое время Лукашенко.

Выходит, что политика «всенародноизбранного» направлена вовсе не на стабилизацию экономики (и финансовой системы в частности), а на национализацию всего возможного и невозможного любыми способами. Ради этого, конечно, можно «устроить» и банковский кризис и многое другое. Только к чему при этом разговоры о мерах по стабилизации экономики.

Наталья УЛЕВСКАЯ

Нет бизнеса – зато есть конференции

10—13 июля в Минске проходила международная конференция «Опыт финансовой поддержки малых и средних предприятий в странах СНГ».

На конференцию собрались представители 12 государств. В ней участвовали как предприниматели, так и представители государственных органов, депутаты ВС, представители международных финансовых организаций и т.д. В очередной раз прозвучала констатация факта слаборазвитости среднего и малого бизнеса в Беларуси и отсутствия государственной поддержки его развития.

Конференция завершилась принятием обращения к главам государств и правительств, парламентам стран СНГ, в котором призвала «осуществлять более энергичные действия по развитию, поддержке и финансированию малого и среднего бизнеса..., ускорить разработку, принятие и выполнение законодательных актов, обеспечивающих стимулирование деловой активности».

Слова хорошие, правильные, известные. А что дальше?

Вероника СТРОЕВА

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Частная собственность на землю: отношение населения Беларуси

Игорь ПЕЛИПАСЬ,
кандидат экономических наук, заместитель директора НИСЭПИ

Вопрос о частной собственности на землю, который является, по сути, чисто экономическим, весьма часто используется в политических целях и переходит в идеологическую плоскость. Его собираются вынести даже на референдум, что, мягко говоря, вызывает недоумение. С таким же успехом можно было бы попытаться узнать у народа Беларуси, допустима ли частная собственность в Беларуси в принципе и следует ли нам вообще проводить экономические реформы. Ведь понятно, что частная собственность, включая собственность на землю, — основа любой рыночной системы.

Многие средства массовой информации, публикуя данные социологических опросов, пытаются внушить, что подавляющему большинству населения Беларуси чужда даже сама идея частной собственности на землю.

Насколько все это соответствует реальному положению дел?

В мае-июне 1996 г. Независимый институт социально-экономических и политических исследований (НИСЭПИ) в рамках проекта «Формирование общественных лидеров в посткоммунистической Беларуси» провел очередной общенациональный опрос взрослого населения Беларуси по репрезентативной выборке (опрошено 1535 человек, ошибка выборки ~ 3%). Используя полученные данные, а также результаты предыдущих общенациональных опросов НИСЭПИ, попытаемся выяснить, **действительно ли население Беларуси в целом выступает против частной собственности на землю.**

Здесь следует заметить, что очень часто ответ на задаваемый респонденту вопрос зависит от его формулировки. Можно, например, спросить у пожилого человека что-то наподобие: *«Хотите ли вы частной собственности на землю, в результате чего доморощенные капиталисты и их зарубежные коллеги скупят всю землю-матушку и заэксплуатируют до смерти народ синеокой Беларуси?»* Ответ на такой вопрос в наших условиях очевиден — «нет». Однако более спокойные и нейтральные формулировки, возможно, приведут к иному ответу и позволят выяснить действительное отношение населения к той или иной проблеме.

В ходе наших опросов вопросы, касающиеся частной собственности на землю, были сформулированы следующим образом: **«Допустима ли частная собственность на землю в Беларуси для ее граждан?»** и **«Допустимо ли, чтобы иностранцы могли владеть землей в Беларуси?»**. Понятно, что допущение частной собственности на землю предполагает также возможность купли-продажи земельных участков (иначе какая же это частная собственность). Кроме того, мы полагаем, что нет смысла, опрашивая население, касаться специфических моментов: например, какая часть земельных угодий и какие земельные участки должны остаться в собственности государства, какие ограничения следует ввести при купле-продаже земли и др. Если вопрос о частной собственности на землю решен в принципе, то все остальные проблемы должны решаться исходя из принципа экономической эффективности и конкретной ситуации.

Итак, что же думают граждане Беларуси по поводу частной собственности на землю? Как видно из *табл. 1*, **начиная с 1993 г. более 70% респондентов высказывались в пользу частной собственности на землю для граждан Беларуси.** Кроме того, нет никаких оснований утверждать, что популярность идеи частной собственности на землю имеет тенденцию к снижению. Что касается другого аспекта проблемы — возможности для иностранных граждан быть собственниками на землю в Беларуси, то сторонников этого значительно меньше. И все же примерно пятая часть опрошенных не усматривает здесь никакой угрозы для нашей страны.

Таблица 1. **Отношение населения Беларуси к частной собственности на землю**

Допустима ли частная собственность на землю в Беларуси для ее граждан?	1993	1994	1995	1996
Да	72,1	72,5	–*	79,1
Нет	26,6	27,0	–*	17,0
Не дали ответа	1,3	0,5	–*	3,9
Допустимо ли, чтобы иностранцы могли владеть землей в Беларуси?				
Да	20,3	20,7	19,5	22,5
Нет	78,2	78,9	80,0	76,5
Не дали ответа	1,5	0,4	0,5	1,3

** Данный вопрос в ходе опроса 1995 г. не задавался.*

Страсти по поводу того, что иностранцы за бесценок могут скупить все и вся, типичны для большинства посткоммунистических стран и, как правило, подогреваются политиками, выступающими против радикальных экономических реформ. Однако практика показывает, что эти опасения в общем беспочвенны: желающих покупать что-либо в бывших соцстранах (особенно с неустойчивой экономической и политической ситуацией) среди иностранцев крайне немного.

Таблица 2. **Отношение городского и сельского населения Беларуси к частной собственности на землю**

Допустима ли частная собственность на землю в Беларуси для ее граждан?	1993	1994	1995	1996
Городские жители	76,2	76,8	–	80,2
Сельские жители	62,2	64,9	–	77,5
Допустимо ли, чтобы иностранцы могли владеть землей в Беларуси?				
Городские жители	25,3	26,0	21,5	28,2
Сельские жители	9,8	10,7	15,4	19,6

